Мясцовае самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
19 ліпеня 2017 г.
№26 (410)



стар. 3

Каб храмы не гарэлі



стар. 5

Знайсці працу ў маленькім горадзе



стар. 8

Куды бягуць малочныя ручаі?

ТЭМА ТЫДНЯ

# На дзесяць вакансій — шэсць прэтэндэнтаў




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**НАКОЛЬКІ складана сёння знайсці работу? Якіх спецыялістаў не хапае наймальнікам? Ці не ствараюцца новыя працоўныя месцы проста «для галачкі»? І калі, нарэшце, павысіцца дапамога па беспрацоўі? У гэтым артыкуле мы пастараліся адказаць на самыя актуальныя пытанні аб занятасці.**

## Напружанасць зніжаецца

У параўнанні з мінулым годам намеціліся пазітыўныя тэндэнцыі.

— Больш за ўсё нас абнадзейвае тое, што расце попыт на працоўную сілу і адпаведна зніжаецца напружанасць на рынку. Калі летась наймальнікі заяўлялі ў сярэднім 34 тысячы вакансій у месяц, то сёння гэта ўжо 50 тысяч. Год таму на адно свабоднае месца прэтэндавала 1,3 беспрацоўнага, цяпер жа — 0,6, — адзначае **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.**

стар. 4

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

# УВЕКАВЕЧЫЛІ ІМЁНЫ ЎСІХ

## Староста вёскі Сітніцкі Двор ініцыявала стварэнне новага помніка на месцы расстрэлу ў 1942 годзе 480 жыхароў

**Вёску Сітніцкі Двор спалілі 12 лістапада 1942 года, а ўсіх яе жыхароў расстралялі і закапалі ў агульнай яме на ўзлеску. У траншэю скідвалі нават тых, хто яшчэ падаваў прыкметы жыцця. Потым некалькі дзён зямля варушылася, расказвалі людзі, якія аплаквалі сваіх сваякоў. Гэтыя страшныя ўспаміны перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Уратавацца ўдалося толькі двaім — 12-гадовай Антаніне і малому хлопчыку Грышы, якога маці сумела адштурхнуць у бок поля, калі іх вялі на расстрэл. Цяпер Антаніне Анісімавай 87 гадоў, Рыгор Клімовіч некалькі гадоў таму пайшоў з жыцця.**

...Сітніцкі Двор — з тых спаленых вёсак, якія адрадзіліся пасля вайны. Цяпер тут налічваецца крыху больш за сотню жыхароў. Старастам людзі абралі аўтарытэтнага чалавека — былога дырэктара школы Галіну Крывулец. Галіна Рыгораўна прыйшла два гады таму да старшыні Сінкевіцкага сельскага Савета Валерыя Краснікевіча з прапановай пабудаваць новы помнік на месцы расстрэлу. Недзе ў 1960-х гадах там быў узведзены тыповы для тэй пары бетонны манумент, на якім змясцілася некалькі лаканічных радкоў з датай трагедыі і лікам ахвяр. Пазней побач устанавілі яшчэ адзін помнік-камень. На ім па-польску былі пазначаны імёны вяскоўцаў-католікаў. Памятны знак зрабілі польскія сваякі загінулых недзе на пачатку 1980-х.

— Але ж людзі справядліва палічылі, што трэба ўвекавечыць імёны ўсіх, — даводзіла староста. — Там ляжаць жыхары вёскі ўсіх пакаленняў, у тым ліку падлеткі, малыя дзеці і зусім немаўляты — тыя, чые ненароджаныя нашчадкі не могуць аддаць даніну памяці.

Старшыня ідэю падтрымаў адразу. Тады ж у сельсавеце намалявалі эскіз помніка, вырашылі, што гэта будзе крыж на фоне адкрытых старонак, на якіх трэба ўмясціць прозвішчы ўсіх 480 вяскоўцаў. Аб'явілі збор грошай. Валерый Краснікевіч кажа, што за даволі кароткі час удалося сабраць пяць мільёнаў недэнамінаваных рублёў. Да работы падключыўся выхадзец з гэтай вёскі, дэпутат Мікашэвіцкага гарадскога Савета дэпутатаў Сямён Ляўковіч.

стар. 3



Новы помнік расстраляным аднавяскоўцам.